# ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО

## *Дарагі Нікалай Фёдаравіч!*

У дзень слаўнага юбілея ленінскага комсомола Беларусі ўрачысты пленум ЦК ЛКСМБ шле табе, выпрабаванаму большэвіку, прыяцелю і кіраўніку ЛКСМБ гарачае комсомольскае прывітанне.

Нікалай Фёдаравіч, мы хочам табе шчыра сказаць, што поспехі, дасягнутыя комсомолам Беларусі ёсць рэзультат неаслабнага штодзеннага большэвіцкага кіраўніцтва ЦК КП(б)Б, які ты ўзначальваеш.

Нашы поспехі ёсць рэзультат перамогі генеральнай лініі партыі, рэзультат геніяльнейшага кіраўніцтва ЦК ВКП(б) і тав. СТАЛІНА.

Твае асабістыя ўказанні, твая перадача нам маладому пакаленню большэвікоў, вопыта барацьбы і традыцый КП(б)Б, за генеральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку заўсёды служылі і служаць баявой праграмай нашай работы.

У дзень нашага юбілея мы ў тваёй асобе даем клятву Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б і надалей яшчэ больш, яшчэ мацней падняць сваю рэволюцыйную пільнасць, мацаваць класавую свядомасць, загартоўвацца ў духу пролетарскага інтэрнацыяналізма, цэментаваць свае рады ў змаганні з класавым ворагам і яго агентурай унутры партыі і комсомола.

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ высока несці сцяг Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна, пільна берагчы яго чыстату.

МЫ ДАЕМ КЛЯТВУ НАШАЙ ПАРТЫІ, што, не шкадуючы сіл, крыві, а калі трэба будзе і жыцця, аддамо за справу Леніна, Сталіна, за справу сусветнай пролетарскай рэволюцыі.

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ мацаваць абароназдольнасць нашай краіны, умацоўваць магутнасць нашай непераможнай Чырвонай арміі, авалодваць ваеннай тэхнікай і, калі патрэбна будзе, па прызыву нашай партыі стаць жалезнымі батальёнамі, авалодаўшымі ваенным майстэрствам сучаснага боя на абарону заваяванняў Окцябра.

МЫ АБАВЯЗВАЕМСЯ падрыхтаваць кадры класава-вытрыманых, большэвіцка-правераных, стойкіх непахісных ленінцаў для ўсіх франтоў вялікай соцыялістычнай будоўлі.

МЫ КЛЯНЕМСЯ НАШАЙ ПАРТЫІ І ЯЕ ЦК, што будзем мацаваць фарпост Савецкага Саюза—БССР, будзем павышаць наш удзел у барацьбе за аўладанне тэхнікай, за асваенне новых прадпрыемстваў, за большэвіцкія калгасы, за заможнае калгаснае жыццё.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*